Адраджэнне

ДАЛУЧАЕМ ДЗЯЦЕЙ ДА ФАЛЬКЛОРУ

У багатай фальклорнай спадчыне беларусаў адлюстравана жыццё народа, яго гісторыя, эстэтычныя погляды, маральна-этычныя ідэалы, выказаны яго спадзяванні. Дзіцячы фальклор належыць да таго віду творчасці народа, які абавязкова ўваходзіць у жыццё кожнага чалавека. Гэта яркае сведчанне клопатаў народа аб выхаванні новых пакаленняў, скарбніца сапраўднай народнай паэзіі.

Стараючыся дапамагчы дзіцяці асэнсаваць гістарычныя, культурныя, маральныя традыцыі беларускага народа, супрацоўнікі гарадской дзіцячай бібліятэкі выкарыстоўваюць розныя формы. Так з 15 лістапада аб"яўлены месячнік Беларускага народнага фальклору, у праграму якога ўвайшлі: "Гадзіна дзіцячага фальклору", "Небыліцы ў творах", "Біном - фантазіі", "Ой, калядачкі, бліны, ладачкі".

Пачынаючы з сярэдзіны лістапада, амаль кожны дзень у бібліятэцы гучыць цудоўная музыка беларускага фальклору, народныя беларускія песні, калыханкі, забаўлянкі, загадкі, прымаўкі, жарты, ідуць спаборніцтвы на лепшы беларускі танец.

Нават супрацоўнікі бібліятэкі не спадзяваліся, што дзеці прымуць такі актыўны ўдзел у мерапрыемствах.

"Гадзіна народнага дзіцячага фальклору" праходзіла 17, 19, 20, 24, 25, 26 лістапада, прынялі ўдзел 168 дзяцей. Пачыналася хвілінка з гутаркі аб дзіцячым фальклоры. Затым конкурс на лепшую народную беларускую песню, частушку, калыханку, загадку і гэтак далей.

Заканчвалася мерапрыемства невялікім канцэртам, або выступленнем лялечнага тэатру з беларускімі народнымі казкамі "Як кот звяроў напалохаў", "Недалікатны сын".

"Небыліцы ў асобах" - 2 - 3 снежня. Спачатку агляд Беларускага фальклору ў часопісах, гучнае чытанне апавядання "Фантазёры", затым конкурс на лепшы расказ немудрагелістых небыліц, якія дзеці самі прыдумалі. Вельмі дзецям спадабалася гэтае мерапрыемства, жадаючых праявіць свае здольнасці ў творчасці было так многа, што нават не ўсім была прадастаўлена магчымасць выказацца. Заканчвалась гадзіна маленькім канцэртам. Удзельнічала 84 дзіцяці.

Месячнік беларускага народнага фальклору працягваецца. Хочацца адзначыць самых актыўных удзельнікаў: Насця Віннік - СШ №7 (1"А"клас); Оля Бордык і Саша Дабравольскі - СШ №7 (1"В"клас); Марына Якімава - СШ №6 (4"В"клас); Наташа Аўчыннікава, Наташа Пятроўская, Алла Самсонкіна - 7"Г"клас, Насця Шэметавец - 7"Е"клас, Уладзік Гаспадараў, Андрэй Кухлеўскі - 4"Е"клас - СШ №6.

Наогул добра падрыхтаванымі, актыўнымі і кемлівымі паказалі сябе дзеці 1"В" класа СШ №6 - кіраўнік Л.П. Бабаед і 1"А" класа СШ №7 - кіраўнік Т.Д. Серада. Усе пераможцы ў конкурсах атрымалі ўзнагароды.

Бацькі і настаўнікі! Калі хочаце, каб вашы дзеці пасябравалі з беларускім народным фальклорам, займальна і цікава правялі час, прыводзьце дзяцей да нас, у дзіцячую бібліятэку.

М. Нікіценка,
бібліятэкар дзіцячай бібліятэкі.